цами дуалистической концепции мироздания. Это проясняет многие аспекты их учения

Они не принимали организацию православной церкви в Византии, не считая ее истинно христианской. Отвергали таинства на основании того, что вещества этого мира принадлежат царству злого бога, осуждали иконопочитание, как идолопоклонство, не почитали богородицу, считая, что Христос воспользовался ее телом, как порталом прибыв из идеального мира, чтобы освободить людей из-под власти злого бога. Не любили креста, ведь на нем распяли Христа, их кумира и т.д.

Именно так выглядят история распространения и развития павликианского учения в Византии и его религиозные основы на момент наивысшего расцвета.

**Литература**


1. *Адонц Н.* Армения в эпоху Юстиниана. СПб., 1908.
2. *Ангелов Д.* Богомильство в Болгарии. М., 1954.
3. *Бартикян* Р.М. Источники для изучения павликианского движения. Ер., 1961.
4. *Васильев А.А.* Византия и арабы. Политические отношения Византии и арабов за время Аморейской династии. СПб., 1900.
5. *Васильев А.А.* Византия и арабы. Политические отношения за время Македонской династии. СПб., 1902.
6. *Васильев Л.Г.* История религий Востока. М., 1999.
7. *Виденгрен Г.* Мани и манихейство. СПб., 2001;
8. *Лебедев А.П.* История Константинопольских соборов IX в. СПб., 2001.
9. *Липшиц Е.Э.* Вопросы павликианского движения. // «Византийский временник» T.V, 1952. С. 134-155.
10. *Липшиц Е.Э.* Очерки византийского общества и культуры. М - Л., 1961.
11. *Удальцова З.В.* Византийская культура. М., 1988;
12. *Успенский Ф.Н.* История Византийской империи VI – IX вв. М., 1999.
13. *Юзбашян К.Н.* Армянские государства эпохи Багратидов и Византия IX – XI вв. М., 1988.


## «МИНСКИЕ ВРАЧЕБНЫЕ ИЗВЕСТИЯ» ДРУКАВАНЫ ОРГАН ТАВАРЫСТВА МІНСКІХ ЎРАЧОЎ


**Н. В. Тыванчук**


Гісторыя аховы здароўя Мінска і ўсёй губерніі к.XIX- п.XX стст. звязана з дзейнасцю Таварыства мінскіх урачоў, якое ва ўмовах адсутнасці вышэйшай медыцынскай школы і наяўнасці бюракратычнага кіравання медыцынскай справай з боку ўрачэбных адзелаў губернскіх праўленняў фактычна з'яўлялася цэнтрам фарміравання асноўных ведаў у практычнай, грамадскай, навуковай дзейнасці ўрачоў.

Першыя медыцынскія таварыствы на Беларусі ўзніклі ў 60–80-я гады XIX ст. у губернскіх гарадах. Трэба дадаць, што медыцынскія таварыствы Беларусі ўзнікалі адначасова з шэрагам найбольш значных таварыстваў Расіі. Адным з першых было арганізавана Таварыства мінскіх ўрачоў. Лічыцца, што яно заснавана ў 1867 г., аднак дакументы паказваюць, што яно ўжо існавала ў 1862 г. Са звестак таго часу вядома, што 23 снежня 1862 г. ў хаце інспектара ўрачэбнай управы, доктара медыцыны Данілы Восіпавіча Спасовіча сабраліся медыкі і фармаколагі г. Мінска на сваё другое паседжанне для выбрання кіраўніцтва таварыства [1, с. 39].

У сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. улады ўзмацнілі рэпрэсіі і таварыства ў сакавіку месяцы таго ж года было «на время закрыто» [2, с. 292]. Урад вырашаў ізноў адкрыць таварыства на працягу некалькі гадоў і толькі ў верасні 1867 г., дзякуючы ініцыятыве ўрачэбнага інспектара Н. К. Берга, яно было зноў адкрыта. Таварыства было трынадцатым па ліку сярод таварыстваў губернскіх цэнтраў Расійскай імперыі [3, с. 82].

Да 1910 г. таварыства публікавала справаздачы аб сваёй дзейнасці, навуковыя артыкулы, медыцынскую хроніку у «Працах Таварыства мінскіх урачоў», якія высылаліся ў адрас 50 іншагародніх медыцынскіх таварыстваў. Затым сталі выходзіць «Минские врачебные известия». Гэта спецыяльнае перыядычнае выданне шырока асвятляла медыцынскія праблемы. Яны рэгулярна выходзілі да 1914 г., а затым, пасля перапынку, іх выданне аднавілася ў 1915 г.[4, с. 81].

Думка аб выданні свайго перыядычнага медыцынскага органа паўстаа сярод ўрачаў Мінскай губерніі яшчэ ў канцы XIX стагодзя. Але непасрэднае абмеркаванне гэтага пытання адбылося на першым з’ездзе ўрачоў Мінскай губерніі, які адбыўся ў 1908 г. Узнікла неабходнасць у выданні перыядычнага органа, у якім маглі б прымаць удзел усе ўрачы і іншыя сябры медыцынскага персанала губерніі; такога органа, у якім маглі б вольна абмяркоўвацца грамадскія і навуковыя пытанні бягучага медыцынскага жыцця і пры дапамозе якога падтрымлівалася б сувязь паміж сябрамі медыцынскага персанала.

Было вырашына назваць гэта выданне «Минские врачебные известия» Першапачаткова памер выдання быў невялікі – ў сярэднім 16 друкаваных старонак, змест да 5-га нумара не друкаваўся. Але затым памер дасягнуў 30 старонак. Кожны нумар каштаваў 30 капеек, а гадавая падпіска- 2 рублі, што было дастаткова дарага. Адказным рэдактарам з’яўляўся ўрач А. З. Яшнін. Рэдакцыя часопіса знаходзілася па адрасу: вуліца Губернатарская, 28. Да сярэдзіны 1911 г. часопіс меў 8–10 нумароў у год, але ж з гэтага часу летні перапынак, што прыпадаў на ліпень, жнівень быў адменены.

Структура выдання была наступнай:

1. Арыгінальныя навуковыя артыкулы. Казуістыка, рэфераты.
2. Дзейнасць медыцынскіх таварыстваў ў губерніі (даклады і пратаколы паседжанняў).
3. Артыкулы і нататкі па ўрачэбна-санітарнай і земскай медыцыне пераважна Мінскай губерніі. Справаздачы лякарняў, нараджальных прыютаў і іншых лякарных ўстаноў губерніі за вызначаны перыяд часу.
4. Карэспандэнцыя і лісты ў рэдакцыю.
5. Хроніка медыцынскага жыцця пераважна Мінскай губерніі.
6. Афіцыйная частка: законы і адміністратыўныя загады па медыцынскай частцы,службовыя зрухі, камандзіроўкі і інш.
7. Фельетоны з медыцынскага побыту.
8. Аб'явы [4, № 1, с. 1].

Гэты часопіс, галоўным чынам прадстаўляў інтарэс для мясцовых ўрачоў, так як ён адлюстроўваў мясцовыя з'явы ўрачэбнага жыцця, патрэбы ўрачэбнай справы і адказваў на надзённыя пытанні. Аднак, ён не выконваў толькі ролю фатографа, ён выкладаў факты і акалічнасці з медыцынскага свету, падкрэсліваў недахопы, прабелы і дэфекты ў дзейнасці ўрачоў губерніі. Ён ўказваў на тыя меры, якія неабходны для паляпшэння і ўпарадкавання ўрачэбнай справы. Па меркаванню галоўных арганізатараў выдання, ён выконваў куды большую ролю, чым першы з'езд ўрачоў, бо яго голас гучаў куды гучней, настойлівей, [4, № 10 с. 4].

Гэта выданне мела чыста медыцынскі сэнс. У Мінскай губерніі тады было прыблізна 200 практыкуючых урачоў[4, № 10 с. 5 ], у кожнага з іх меліся вядомыя казуістычныя матэрыялы, як з лякарскай, так і з прыватнай практыкі, судова-медыцынскага свету, з ваеннай, чыгуначнай медыцыны, санітарыі. Але да гэтага дзяліцца вопытам маглі толькі 50–60 ўрачоў і толькі з ліку сяброў мінскага таварыства. Астатнія, калі б яны пажадалі гэта зрабіць, павінны былі змяшчаць свае артыкулы ў сталічнай медыцынскай прэсе. Многія гэтага не рабілі ці то па сваёй сціпласці, ці то па прычыне таго, што іх артыкулы мелі толькі мясцовы інтарэс, і не маглі зацікавіць шырокія медыцынскія колы. Пры існаванні ж мясцовага медыцынскага органа ўсё гэтыя праблемы самі сабою адпалі. І важны практычны матэрыял мясцовага характару даходзіў да шырокага колу ўрачоў.

Перыядычны орган меў адмысловае значэнне для таварыства мінскіх ўрачоў, бо раней друкуемыя раз ў два гады так званыя «Працы» рассылаліся ў розныя канцы Расійскай імперыі, не толькі не чыталіся, напр., арэнбургскімі ўрачамі, але нават і ўрачамі Мінскай губерніі. Першыя не чыталі іх па той жа прычыне, па якой мы не чытаем прац арэнбурскага

таварыства ўрачаў; другія не чыталі іх на той простай падставе, што яны іх не бачылі ў газетах ( працы рассылаліся толькі медыцынскім таварыствам, а не індывідуальным асобам). Таму друкуемыя «працы» мелі толькі неабгрунтаваныя выдаткі і займалі месца на паліцах розных медыцынскіх бібліатэк [4, №10 с.6].

Пазней да друкавання ў часопісе былі далучаны і сябры Бабруйскага таварыства ўрачоў, урачы іншых заходніх губерняў, нават дзеячы прыродазнаўчых навук, статысты, некаторыя земскія грамадскія дзеячы.

У Мінску ў тыя гады медыцынскае жыццё хутка пайшло наперад. Павялічылася колькасць прыватных медыцынскіх устаноў, з’явіліся навучальна-дапаможныя медыцынскія школы, ўстановы для падрыхтоўкі асоб з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Усе гэтыя ўстановы, акрамя афіцыйнага і дзяржаўнага кантролю мелі неабходнасць у кантролі грамадскага погляду. Такія функцыі ўзяў на сябе часопіс. Зразумела, што часопіс ад гэтага толькі выйграваў. Па сутнасці, ён з’яўляўся дапаможным навуковым выданнем.

**Літаратура**


1. Современная медицина. 1863. № 2.
2. Современная медицина. 1863. № 14.
3. *Молчанов А.П.* Новые материалы из истории возникновения медицинских обществ Белоруссии.// Здравоохранение Белоруссии. 1969. №5.
4. Минские врачебные известия. 1910. №1 .
5. Минские врачебные известия. 1911. №1–12.
6. Минские врачебные известия. 1912. №1–11.
7. Минские врачебные известия. 1913. №1–12.
8. Минские врачебные известия. 1914. №1,4,5.
9. Минские врачебные известия. 1915. №1,2,3,7,8.


## РЭЛІГІЙНАЯ ПАЛІТЫКА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ЛІТОЎСКАГА АЛЬГЕРДА (1345–1377)


**У. В. Фёдараў**


Перыяд княжання Альгерда з’ўляецца вельмі важным ў гісторыі ВКЛ, ды і наогул, Усходняй Еўропы. У гэты час назіраецца буйная тэрытарыяльная экспансія Літвы на ўсход і на поўдзень, яна пачынае прэтэндаваць на спадчыну былой Старажытнай Русі. Адначасова з гэтым, ціск Тэўтонскага ордэна паступова ўзрастае.

Складаная знешнепалітычная сітуацыя, а ў дадатак да яе ўнутрыпалітычнае становішча дзяржавы – моцныя пазіцыі язычнікаў у ёй і адначасова павышэнне колькасці праваслаўных падданых па меры прасоўвання на ўсход, прымушалі кіруючыя колы праводзіць адпавед-